*І.Я. КАРАВАЙ*

# УПЛЫЎ ФЕДЭРАТЫЎНАЙ КАНЦЭПЦЫІ НА ЛЁС БЕЛАРУСІ НАПЯРЭДАДНІ І ПАДЧАС ПОЛЬСКА-САВЕЦКАЙ ВАЙНЫ 1919–1920 гг.

Посвящена проблеме влияния федеративной концепции, выработанной польским лидером Ю. Пилсудским, на судьбу белорусской государственности и народа перед и во время польско-советской войны 1919–1920 гг. Использованы архивные источники, а также монографические исследования и статьи как белорусских, так и польских историков.

This article is devoted to the problem of influence of the federal program produced by Polish leader Y. Pilsudsky on the process of the establishment of the Belarusian nation and state before and during the Polish-Soviet War. It examines the basic directions in the development of the federal conception in this period. The article is based on the archieve documents, monographs and articles written by both Polish and Belarusian historians.

Працэс станаўлення беларускай дзяржаўнасці ў першай палове ХХ ст. непарыўна звязаны з тымі падзеямі, асобамі, палітычнымі канцэпцыямі, якія паўплывалі карэнным чынам на яе лёс. Да такіх падзей трэба аднесці савецка-польскую вайну 1919–1920 гг. і Рыжскі мір, што афіцыйна падводзіў рысу пад гэтай вайной і трагічным чынам адбіўся на лёсе Беларусі. Заходняя Беларусь была далучана да Польшчы і падзелена на чатыры паветы, а на ўсходзе працягвала існаваць БССР. Немалаважную ролю ў стварэнні такой сітуацыі адыгралі тыя палітычныя канцэпцыі ўсходняй палітыкі ў цэлым і лёсу беларускага краю ў прыватнасці, што існавалі ў польскім палітычным бамондзе ды і наогул у польскім грамадстве яшчэ да пачатку Першай сусветнай вайны і тым больш да пачатку польска-савецкай вайны 1919–1920 гг. Абагуліць іх можна было б наступным чынам: палякі, уладальнікі маёнткаў з Украіны, жадалі далучэння яе да Польшчы, палякі з Беларусі – далучэння Беларусі як адвечна польскіх земель, а супрацьстаяць таму азначала здраду ідэі польскай дзяржаўнасці. Ніхто не лічыўся з тым, што ішоў новы час, паўсталі новыя ідэі і іх носьбіты ў гэтым рэгіёне і што праблемы ўсходняга памежжа не былі вядомы новаму пакаленню палякаў.

Узнятае пытанне застаецца актуальным і яшчэ неналежным чынам разгледжана ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі. На сённяшні дзень асобнага навуковага даследавання, у якім бы аналізаваўся ўплыў федэратыўнай канцэпцыі на рэалізацыю ўсходняй палітыкі адноўленай польскай дзяржавы напярэдадні і падчас польска-савецкай вайны, не існуе. Характарыстыка асобных пазіцый гэтай канцэпцыі прадстаўлена ў манаграфіі У.Ф. Ладысева і П.І. Брыгадзіна[1], у даследаванні У.А. Круталевіча[2], у нарысах «Беларусь у еўрапейскай палітыцы 1918–1925 гг. Нарысы»[3]. Развіццё федэралістычнай канцэпцыі разглядаецца Ю. Кітуркам, але ён пры аналізе абмяжоўваецца толькі 1908 г.[4]

Польская гістарыяграфія, у сваю чаргу, наадварот, падрабязна разглядае федэратыўную канцэпцыю. Адной з першых з'явілася заснаваная на шырокім коле архіўных крыніц даследчая праца А. Дзяругі[5], у якой аналізуюцца розныя падыходы ў магчымай рэалізацыі ідэі федэрацыі. Аднак трэба адзначыць, што да пачатку 90-х гг. ХХ ст. у польскай гістарыяграфіі амаль адсутнічала аб'ектыўнасць пры разглядзе гэтага пытання. Пасля развалу СССР сітуацыя змянілася, і ў свет выйшла вялікая колькасць публікацый, прысвечаных фэдэралістычнаму падыходу і яго ўплыву на рэалізацыю польскай усходняй палітыкі[6].

Свае асноўныя погляды і канцэпцыі на знешнюю палітыку на ўсходнім кірунку, у тым ліку і на дзяржаўнасць малых народаў (беларусаў, літоўцаў, украінцаў), прадстаўнікі польскай палітычнай эліты сфармулявалі яшчэ ў пачатку ХХ ст. Сярод гэтых канцэпцый можна выдзеліць дзве асноўныя: федэратыўную, чыё існаванне звязваецца з Ю. Пілсудскім, і інкарпарацыйную, аўтарства якой прыпісваецца кіраўніку польскіх нацыянал-дэмакратаў Р. Дмоўскаму. Нягледзячы на амаль супрацьлегласць тэрытарыяльных праграм узгаданых палітыкаў, яны маюць агульнасць: беларускія тэрыторыі звязваліся з Вялікім княствам Літоўскім і Польскім Каралеўствам, а беларуская нацыя адносілася да негістарычных, не мела традыцыі дзяржаўнасці.

Але найбольшы ўплыў на развіццё ўсходняй палітыкі ў 1918–1921 гг. аказаў кіраўнік адноўленай у лістападзе 1918 г. польскай дзяржавы Ю. Пілсудскі. Ён зыходзіў з таго, што лёс заходняй мяжы Польшчы залежаў ад рашэння краін Антанты, таму дыпламатычную барацьбу за яе пакінуў на Р. Дмоўскага і І.Я. Падэрэўскага. На ўсходзе ж стварыліся спрыяльныя абставіны, якія дазвалялі дзейнічаць самастойна, без аглядкі на кагосьці, і паспрабаваць рэалізаваць сваю федэратыўную канцэпцыю[7]. Таму варта падрабязней разгледзець погляды кіраўніка польскай дзяржавы на лёс Беларусі.

Федэралісты на чале з Ю. Пілсудскім вымушаны былі лічыцца з ростам папулярнасці ідэй нацыянальнага раўнапраўя і самавызначэння. Акрамя таго, палітыкі, якія падтрымлівалі федэратыўную канцэпцыю, схіляліся да высновы, што далучэнне не можа насіць гвалтоўны характар, а павінна адбывацца толькі пры ўзаемным жаданні[8].

Сваімі каранямі праграма федэрацыі звязана з праграмай Польскай сацыялістычнай партыі (ППС), прынятай на парыжскай канферэнцыі ў 1892 г., у якой прадугледжвалася роўнасць паміж народамі, што ўваходзілі ў склад будучай польскай дзяржавы на аснове добраахвотнай федэрацыі. Нацыянальна-тэрытарыяльная праграма ППС праходзіла розныя фазы, нават некаторым чынам збліжаючыся з канцэпцыяй інкарпарацыі, але на завяршаючым этапе Першай сусветнай вайны, калі адбываўся рост нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, літоўцаў, украінцаў, федэратыўныя погляды атрымалі новы штуршок. Дадзеная канцэпцыя стала асновай для рэалізацыі ўсходняй палітыкі Польшчы лагерам прыхільнікаў Ю. Пілсудскага, былога лідэра партыі. У 1917 г. у праграмных дакументах партыі адзначалася, што існаванне незалежнай польскай дзяржавы можа быць толькі пры падзенні Расійскай імперыі, да таго ж вакол будучай Польшчы будзе створаны шэраг буферных дзяржаў – Вялікае княства Літоўскае (у склад якога ўваходзілі б і беларускія землі) і Украіна[9].

Кіраўнік польскай дзяржавы прапанаваў план стварэння ва Усходняй Еўропе максімальна шырокай федэрацыі дзяржаў пад верхавенствам Польшчы, які разглядаў у якасці інструмента, накіраванага на аслабленне Расіі. Такі падыход, з аднаго боку, задавальняў заходнія краіны, бо ўсходняя палітыка Польшчы ў гэтым выпадку мела не імперыялістычны, а нацыянальна-вызваленчы характар, а з іншага боку, Польшча набывала сабе саюзнікаў сярод народаў, у тым ліку і беларусаў, вызваленых з-пад расійскага панавання[10]. У плане кіраўнік дзяржавы даваў беларусам шанс на самавызначэнне, незалежна ад скептыцызму, з якім ён ставіўся да іх дзяржаўных здольнасцей. Акрамя таго, існаваў і другі – «меншы» план, у якім прапаноўваўся падзел спрэчных зямель паміж Польшчай і Расіяй на аснове праведзенага пад міжнародным кантролем плебісцыту, а таксама адзначалася, што падтрымка беларускасці мае сэнс толькі на тэрыторыі Міншчыны ў якасці буфера супраць Расіі[11].

Пасля аднаўлення польскай дзяржаўнасці Ю. Пілсудскі паспрабаваў рэалізаваць свае планы на практыцы. Ён пачаў рыхтавацца да вайны з Расіяй, праз якую імкнуўся здзейсніць федэратыўную канцэпцыю. Матэрыяльную і фінансавую дапамогу аказвалі краіны Антанты, і да сярэдзіны лютага 1919 г., калі пачаліся першыя польска-савецкія сутычкі, польскае войска ўжо ўяўляла пагрозу. Погляды Ю. Пілсудскага ў гэты перыяд найлепшым чынам бачны з размовы са сваім паплечнікам В. Бараноўскім. Накіроўваючы яго ў Парыж на пасяджэнне мірнай канферэнцыі ў лютым 1919 г., кіраўнік дзяржавы інструктаваў наступным чынам: «У гэты момант Польшча ўласна не мае межаў, і ўсё, што мы можам атрымаць на захадзе, залежыць ад Антанты, наколькі яна пажадае, больш або менш, сціснуць немцаў. На ўсходзе – іншая справа. Тут дзверы, якія адчыняюцца і зачыняюцца ў залежнасці ад таго, хто і з якой сілай іх адчыняе»[12]. Кіраўнік дзяржавы імкнуўся стварыць «Вялікую Польшчу», куды б уваходзілі землі былога ВКЛ і Украіны, што павінны далучыцца да яе і канцэнтравацца як каля натуральнага абаронцы ад расійскай пагрозы.

Вяртанне пад кантроль польскіх улад Вільні пасля паспяховай ваеннай аперацыі ў красавіку 1919 г. прывяло да змены ва ўсходняй палітыцы Польшчы, паколькі з-пад расійскага ўплыву забіралася большасць зямель былога ВКЛ. Таму 22 красавіка 1919 г. кіраўнік краіны выдаў адозву «Да жыхароў былога Вялікага княства Літоўскага», дзе запэўніваў, што «польскае войска прыйшло, каб знішчыць уладу, што кіравала супраць волі мясцовага насельніцтва, каб вырашыць нацыянальнае пытанне ў гэтым рэгіёне шляхам роўных выбараў». У адозве заяўлялася аб стварэнні цывільнага кіраўніцтва ўсходніх зямель на чале з Ежы Асмалоўскім, якое па плану Пілсудскага павінна было складацца з «мясцовых прадстаўнікоў, сыноў той зямлі»[13].

Пасля заняцця 8 жніўня 1919 г. польскімі войскамі Мінска зноў загучалі абяцанні пра «свабоду, роўнасць, братэрства». Шматасобнымі тыражамі распаўсюджвалася віленская адозва Ю. Пілсудскага, з яго вуснаў гучалі запэўніванні, што Польшча і Беларусь будуць жыць як роўныя з роўнымі. Неўзабаве пасля ўваходу ў Мінск польскія вайсковыя ўлады выдалі дазвол на стварэнне Часовага Беларускага нацыянальнага камітэта на чале з А. Прушынскім і на выданне газеты «Звон», якая друкавалася на польскія грошы і «адлюстроўвала» настроі новых уладароў.

18 верасня 1919 г. у Мінск прыбыў сам кіраўнік польскай дзяржавы. На наступны дзень, 19 верасня, падчас спаткання з прадстаўнікамі Міншчыны ён выступіў на беларускай мове, разлічваючы такім чынам прыцягнуць прадстаўнікоў беларускага нацыянальнага руху да супольнай працы. Ю. Пілсудскі запэўніваў, што «зямлі гэтай нічога навязана не будзе, што зямля гэтая вольная і свабодны свой голас між іншых падыме, што зямля гэтая сама вырашыць, як ёй жыць, якім правам сабой распараджацца»[14]. «Я буду ганарыцца Польшчай, польскімі салдатамі і самім сабой, калі змагу даць гэтым землям свабоду і аб'яднаць іх, – казаў Ю. Пілсудскі і дадаваў: – Пакуль я буду камандаваць польскімі войскамі – гарантую вам паабяцаную мной свабоду»[15]. Далей завяраў прысутных на сустрэчы, што яны ў найбліжэйшы час будуць прызваны да таго, каб «перш за ўсё самім пачаць кіраваць у органах самакіравання і ў будучым вырашыць, як беларуская дзяржава будзе будавацца»[16]. Ноччу таго ж дня ён выехаў з Мінска да Варшавы[17].

Нягледзячы на ўсе намаганні Ю. Пілсудскага, яму не ўдалося прыцягнуць да супрацоўніцтва пераважную большасць беларускіх нацыянальных дзеячаў, за выключэннем членаў прапольскі арыентаванага Часовага Беларускага нацыянальнага камітэта, а таксама палякаў, якія пражывалі на беларускіх землях. Наогул, мінскую сустрэчу можна лічыць апафеозам беларуска-польскіх адносін. Рэчаіснасць і палітычныя абставіны адмоўна паўплывалі на вырашэнне беларускага пытання. Да такіх абставін можна аднесці і адносную слабасць беларускага нацыянальнага руху і нежаданне заходніх саюзнікаў Польшчы, у першую чаргу Англіі, падтрымліваць новыя малыя дзяржавы, што ствараліся на рэштках былой Расійскай імперыі і выступалі за захаванне цэласнаці расійскай дзяржавы.

Але кіраўнік польскай дзяржавы не адмовіўся ад ідэі стварэння беларускай дзяржаўнасці ў межах федэратыўнай канцэпцыі. На гэты раз у выглядзе «Беларускага П’емонту» – тэрыторыі, абмежаванай Міншчынай, з цэнтрам у г. Мінску, і залежнай ад Польшчы. Такую ідэю Ю. Пілсудскі выказаў Л. Васілеўскаму падчас канферэнцыі балтыйскіх дзяржаў, што праходзіла ў Хельсінкі напрыканцы 1919 г. Па яго словах, Беларусь яшчэ не была прыгатавана да сваёй дзяржаўнасці, а вырашэнне беларускага пытання магло прывесці да агульнага ўскладнення становішча Польшчы на міжнароднай арэне[18].

Наступны і амаль апошні шанс для рэалізацыі планаў Ю. Пілсудскага, а заадно і збліжэння польскіх і беларускіх пазіцый меў месца ў пачатку лютага 1920 г., калі ў Вільні прайшла сустрэча Ю. Пілсудскага з В. Іваноўскім, падчас якой абмяркоўваліся важныя для Беларусі справы. Адным з вынікаў перамоў з’явілася рашэнне аб правядзенні афіцыйнай польска-беларускай канферэнцыі для абмеркавання будучага краіны. Пры гэтым трэба адзначыць, што Ю. Пілсудскі яшчэ 1 лютага дазволіў сабе сказаць, што з’яўляецца праціўнікам беларускай фікцыі. Падрыхтоўку канферэнцыі даручыў, аднак, не Ю. Асмалоўскаму, а міністру замежных спраў Польшчы Ст. Патаку, а гэта быў асабліва значны факт. 1 сакавіка 1920 г. старшынёй камісіі па апрацоўцы праекта ўрэгулявання польска-беларускіх адносін і правядзення перагавораў з прадстаўнікамі Беларусі прызначылі Л. Васілеўскага[19].

Беларускі бок разлічваў на шчырасць польскіх палітыкаў, таму, выказваючы свае асноўныя патрабаванні ў «Мемарыяле па беларускай справе», які 16 сакавіка перадалі Л. Васілеўскаму, на першае месца ставілі пункт аб прадухіленні падзелу Беларусі. Такім чынам, хаця край і апынуўся б у польскай палітычнай арбіце, аднак Польшча, спадзяваліся беларусы, была б абавязана вырашыць лёс Беларусі згодна з воляй беларускага народа.

Па выніках перамоў, што праходзілі з 20 па 24 сакавіка 1920 г. у Мінску з удзелам В. Іваноўскага і Л. Васілеўскага, беларускі бок атрымаў менш грошай, чым хацелася, аднак здабытыя сродкі дазвалялі разгарнуць беларускую справу на Міншчыне. Польскі бок фармальна не прыняў ніякіх абавязкаў наконт беларускай дзяржаўнасці, але выказаў гатоўнасць да аб’яднання беларускіх зямель у адну цэласнасць, што ў выпадку паспяховых мірных перамоў стварала б рэальную перспектыву для беларуска-польскай федэрацыі[20].

Апошняй спробай рэалізацыі федэратыўнай канцэпцыі ў правядзенні ўсходняй палітыкі Польшчы з’яўляецца падрыхтаваны Ю. Пілсудскім «бунт» беларуска-літоўскай дывізіі на чале з Л. Жэлігоўскім. Гэтай ваеннай акцыі папярэджвала палітычная нарада ў Варшаве, у якой з польскага боку ўдзельнічалі В. Абрамовіч, Б. Кжыжыноўскі і інш., а з беларускага – В. Іваноўскі, Б. Тарашкевіч і Л. Дубейкоўскі. Польскія палітыкі заспакойвалі, што пасля захопу Вільні Ю. Пілсудскі мае намер стварыць краёвы ўрад, сейм[21]. Новае дзяржаўнае ўтварэнне будзе складацца з 3 кантонаў, падзеленых у адпаведнасці з нацыянальнай структурай насельніцтва ў іх, − Віленскі (польскі), Мінскі (беларускі) і Ковенскі (літоўскі). У аддаленай перспектыве прадугледжвалася злучэнне гэтай дзяржавы з Польшчай на прынцыпах федэрацыі. Актыўныя ваенныя дзеянні на гэтым напрамку пачаліся 8 кастрычніка 1920 г. Л. Жэлігоўскі рушыў на чале беларуска-літоўскай дывізіі на Вільню і на наступны дзень заняў горад. 12 кастрычніка было абвешчана аб стварэнні новай дзяржавы – Сярэдняй Літвы – і скліканні яе ўрада, Часовай урадавай камісіі. Старшынёй камісіі Жэлігоўскі прызначыў В. Абрамовіча, а ў яе склад увайшлі браты Вацлаў і Юрый Іваноўскія і Б. Тарашкевіч[22].

Трэба адзначыць, што на фарміраванне поглядаў кіраўніка польскай дзяржавы аказала ўплыў тагачасная палітычная эліта Польшчы, у планах якой па рэалізацыі ўсходняй палітыкі былі адлюстраваны рысы федэралізму.

Адным з варыянтаў палітычнай канцэпцыі, у якой можна знайсці рысы федэралізму, з’яўляецца праграма польскага палітычнага дзеяча, прадстаўніка кіеўскай левай буржуазіі Я. Старчэўскага. Так, у мемарыяле ад 4 кастрычніка 1918 г. змяшчаліся прапановы з мэтай рэалізацыі іх урадам Марачэўскага – Васілеўскага: акупіраваць тэрыторыі былога ВКЛ (Беларусь, Літва і Украіна) і аднавіць існаваўшую раней Рэч Паспалітую на ўмовах сучаснага федэралізму ў выглядзе уніі Польшчы, Беларусі, Літвы і Украіны[23].

Яшчэ адзін варыянт федэратыўнай канцэпцыі прапаноўваў Л. Васілеўскі, член ППС, міністр замежных спраў (1918 г.). Яго погляды пастулова эвалюцыяніравалі ад пазіцыі амаль інкарпарацыйнай да федэратыўнай. У адпаведнасці з першапачатковымі планамі, што склаліся яшчэ да Першай сусветнай вайны, беларускія землі, на якіх пераважалі беларусы каталіцкага веравызнання, так званая «каталіцкая Беларусь», павінны былі ўваходзіць у склад Польшчы, бо ў іншым выпадку палякам, якія складалі пэўны працэнт насельніцтва гэтага рэгіёна, пагражала русіфікацыя[24].

На пачатку польска-савецкай вайны погляды Л. Васілеўскага наблізіліся да поглядаў Ю. Піл-

судскага. Так, Польшча павінна была праводзіць традыцыйную польскую палітыку – не гвалтам навязваць свае намеры, а ставіць сябе як вольны з вольным, роўны з роўным у дачыненні да народаў былога ВКЛ, даць магчымасць для рэалізацыі беларускай дзяржаўнасці, аднак толькі ў саюзе з польскай дзяржавай. Пры гэтым Л. Васілеўскі заўсёды на першы план ставіў інтарэсы Польшчы.

Гарачым прыхільнікам федэрацыі ва Усходняй Еўропе з'яўляўся І.Я. Падэрэўскі, які ў час Першай сусветнай вайны знаходзіўся ў ЗША і праяўляў схільнасць да барацьбы за аднаўленне Польшчы. Пасля ўтварэння Польскага нацыянальнага камітэта выконваў ролю яго прадстаўніка ў Злучаных Штатах. Свае погляды на арганізацыю фэдэратыўнай дзяржавы на ўсходзе Еўропы ён выказаў у мемарыяле да прэзідэнта ЗША В. Вільсана ад 11 студзеня 1917 г., у якім прапаноўваў стварыць у будучым Злучаныя Штаты Польшчы з удзелам Каралеўства Польскага, Літвы (у тым ліку і беларускіх зямель), Палесся, Галіцыі, Падолля і Валыні. Гэтая праграма засноўвалася на пануючай у ЗША сістэме кіравання з тым выключэннем, што прэзідэнт Злучаных Штатаў Польшчы, каб узмацніць сваю ўладу, павінен быў насіць тытул караля Польшчы, Літвы, Галіцыі і Палесся. Як бачым, Беларусь не была прадстаўлена ў выглядзе штата, а толькі падзелена паміж Польшчай, Літвой і Галіцыяй[25].

Інакш да федэратыўнага падыходу ставіліся аўтары палітычных брашур, паплечнікі Ю. Пілсудскага, выдадзеных у 1918 г. у рамках серыі «Вольны з вольнымі, роўны з роўнымі».

Першая з гэтых брашур «Справа "крэсовых народаў" былой Расіі» выйшла ананімна. Верагоднымі аўтарамі яе з'яўляліся Л. Васілеўскі, В. Наркевіч-Йодко, Б. Страшэвіч. Аўтары занепакоены планамі Антанты, якая пасля пачатку ваеннай інтэрвенцыі мела намер перанесці межы буржуазнай Расіі на захад, да Нёмана і Заходняга Буга. У спрэчцы паміж памежнымі народамі і Польшчай аўтары звяртаюць увагу толькі на два моманты: пытанне межаў і праблему праў грамадзян аднаго народа на тэрыторыі другога, высвятляючы пры гэтым, што размова ідзе аб антаганізме паміж культурай мясцовых народаў і цывілізацыйна старэйшай польскай культурай. Асноўны вывад: па Нёману і Дняпру суседам Польшчы не павінна быць Расія[26].

Другая брашура належала былому віцэ-дырэктару палітычнага дэпартамента Рэгенцкай рады прафесару гісторыі В. Камянецкаму, які такім шляхам імкнуўся ўзяць старт для сваёй новай палітычнай кар'еры[27].

Паводле В. Камянецкага, ідэальным рашэннем з'яўляўся падзел зямель былога ВКЛ на тры кантоны. Першы кантон утварала б ковенская Літва з галоўнымі гарадамі: Коўна, Клайпеда, Лібава, Шаўлі. Другі кантон, «аўтаномная правінцыя», цэнтрам меў Вільню і складаўся б з тых паветаў, якія называлі «польска-беларускай Літвой», а менавіта: Віленскі, частка Трокскага, Гродзенскі, Лідскі, Ваўкавыскі, Беластоцкі, Сокульскі і Бельскі. У Вільні павінен быў адбыцца сейм, што вызначыў бы дзяржаўную мову. Трэці кантон з'яўляўся б беларускім з цэнтрам у Мінску. Агульная колькасць насельніцтва, па падліках аўтара канцэпцыі, у будучай літоўскай дзяржаве складзе каля 8 мільёнаў чалавек[28]. Што датычыцца краёвых сеймаў, то В. Камянецкі прапануе два падыходы: альбо сеймы ў Вільні, Коўне, Беластоку, Пінску і Мінску, альбо стварэнне сеймаў у Вільні, Коўне і Мінску[29].

Такім чынам, планы Ю. Пілсудскага так і засталіся нерэалізаванымі. У пэўнай ступені гэтаму перашкодзіла падпісанне спачатку 12 кастрычніка 1920 г. прэлімінарнага, а потым 18 сакавіка 1921 г. Рыжскага мірнага дагавора. Але, з іншага боку, кіраўнік польскай дзяржавы толькі ў сваіх прамовах і адозвах імкнуўся да стварэння беларускай дзяржаўнасці. На самай справе галоўным для яго было максімальнае адарванне зямель былой Рэчы Паспалітай ад Расіі і далучэнне іх да адроджанай Польшчы, і такім чынам мяжа расійскай дзяржавы адсоўвалася дастаткова далёка на ўсход ад этнаграфічных межаў польскай дзяржавы, што стварала вакол сябе пояс бяспекі. Незалежна ад характару ўлады ў Расіі, савецкага або царскага, на думку тагачаснага польскага лідэра, выказаную яшчэ вясной 1919 г., краіна заставалася імперыялістычнай і планавала напад на Польшчу[30]. Лозунг федэрацыі насіў перш за ўсё характар прапаганды, а Ю. Пілсудскі проста імкнуўся такім спосабам завуаліраваць перад заходнімі партнёрамі і саюзнікамі сваю захопніцкую палітыку, якую праводзіў у дачыненні да ўсходніх зямель былой Рэчы Паспалітай.

[1] Гл.: Ладысеў У.Ф., Брыгадзін П.І. Паміж Усходам і Захадам: Станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917–1939 гг.). Мн., 2003. 307 с.

[2] Гл.: Круталевич В.А. История Беларуси. Становление национальной державности. 2-е изд., доп. Мн., 2003.

[3] Гл.: Лазько Р.Р., Кротаў А.М., Мязга М.М. Беларусь у еўрапейскай палітыцы 1918–1925 гг. Нарысы. Гомель, 2003.

[4] Гл.: Кітурка Ю.В. Беларусь у палітычных канцэпцыях Ю. Пілсудскага і Р. Дмоўскага (1892–1908 гг.): Дыс. … канд. гіст. навук. Гродна, 2001.

[5] Гл.: Deruga A. Polityka wschodnia Polski wobec ziem Litwy, Białorusi i Ukrainy (1918–1919). Warszawa, 1969.

[6] Гл.: Balcerak W. Sprawa białoruska a polityka odradzającej się Rzeczypospolitej // Polska-Białorus 1918–1945. Warszawa, 1994. S. 6–31; Chubiński A. Walka Józefa Pilsudskego o nowy kstalt polityczny Europy Środkowo-Wschodnej w latach 1918–1921. Toruń, 2002; Gomołka K. Kwestia Białoruska w programie PPS w latach 1918–1919 / Studi Polsko-Litewsko-Białoruskie. Praca zbiorowa pod red. J. Tomaszewskiego i in. Warszawa, 1988. S. 107–127; Łukomski G. Walka Rzeczypospolitej o kresy północno-wschodnie 1918–1920. Polityka i działania militarne. Poznań, 1994; Wojnicka M. Stosunek Polski do Białorusi w latach 1918–1920 // Odrodzona Polska wśrod sąsiadów 1918–1921. Warszawa, 1999. S. 76–87.

[7] Ibid.

[8] Гл.: Круталевич В.А. История Беларуси... С. 216.

[9] Гл.: Kumaniecki J. Pokoj polsko-radziecki 1921. Geneza. Rokowania. Traktat. Komisje mieszane. Warszawa, 1985. S. 12.

[10] Гл.: Польско-советская война 1919–1920 (Ранее не опубликованные документы и материалы): В 2 ч. М., 1994. Ч. 1. С. 43; Лазько Р.Р., Кротаў А.М., Мязга М.М. Беларусь у еўрапейскай палітыцы 1918–1925 гг. Нарысы... С. 22.

[11] Гл.: Ладысеў У.Ф., Брыгадзін П.І. Паміж Усходам і Захадам... С. 115.
[12] Łukomski G. Walka Rzeczypospolitej o kresy północno-wschodnie... S. 27.
[13] Balcerak W. Sprawa białoruska... S. 17.
[14] Ibid. S. 18.
[15] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 60. Воп. 3. Спр. 247. Арк. 33.
[16] Астрога В., Скалабан В. Пілсудскі ў Мінску. Хроніка аднаго візіту // Спадчына. 1998. № 4. С. 45.
[17] Гл.: НАРБ. Ф. 60. Воп. 3. Спр. 247. Арк. 34.
[18] Гл.: Balcerak W. Sprawa białoruska... S. 20.
[19] Гл.: Wojnicka M. Stosunek Polski do Białorusi w latach 1918–1920 // Odrodzona Polska wśrod sąsiadów 1918–1921. S. 86; Туронак Ю. В. Іваноўскі і адраджэнне Беларусі // Маладосць. 1994. № 8. С. 237.
[20] Гл.: Туронак Ю. В. Іваноўскі... С. 238.
[21] Гл.: Латышонак А. Беларуская палітыка Пілсудскага ўвосень 1920 г. // Рыжскі мірны дагавор 1921 г. і лёсы народаў Усходняй Еўропы: Матэрыялы міжнар. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 16–17 сак. 2001 г. Мн., 2001. С. 24.
[22] Гл.: Туронак Ю. В. Іваноўскі... С. 239.
[23] Гл.: Deruga A. Polityka wschodnia Polski... S. 18–19.
[24] Гл.: Gomołka K. Kwestia Białoruska w programie PPS... S. 112.
[25] Гл.: Chubiński A. Walka Józefa Pilsudskego... S. 53–54.
[26] Гл.: Deruga A. Polityka wschodnia Polski... S. 20.
[27] Гл.: Łukomski G. Walka Rzeczypospolitej o kresy północno-wschodnie... S. 85.
[28] Гл.: Chubiński A. Walka Józefa Pilsudskego... S. 55.
[29] Гл.: Deruga A. Polityka wschodnia Polski... S. 21.
[30] Гл.: Польско-советская война 1919–1920... С. 43.

Паступіў у рэдакцыю 15.02.07.

***Іван Яўстафіевіч Каравай*** – аспірант кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу. Навуковы кіраўнік – доктар гістарычных навук, прафесар У.Ф. Ладысеў.